**ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна”**

**Аддзел бібліятэказнаўства**



# Беларускія пісьменнікі-юбіляры 2016 года

## II паўгоддзе

**Мінск 2016**

ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна”
Аддзел бібліятэказнаўства

# Беларускія пісьменнікі-юбіляры 2016 года:

## Бібліяграфічны паказальнік

## II паўгоддзе

**Мінск 2016**

## Змест

**Ліпень.**
Міхась Лазарук………………………………………… 4

**Жнівень.**
Павел Дзюбайла……………………………………... 7

**Верасень.**
Ігнат Дуброўскі ……………………………………….. 9

**Кастрычнік.**
Іван Муравейка ………………………………………... 11

**Снежань.**
Сцяпан Александровіч ……………………………... 13

## Ліпень



### Міхась Лазарук
(1926–2000)

Міхаіл Арсенавіч Лазарук нарадзіўся ў вёсцы Ушаловічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў простай сялянскай сям'і. Першапачатковую адукацыю ён атрымаў у Васілінкаўскай няпоўнай сярэдняй школе. У 1940 г. паступіў у Мінскі дарожна-механічны тэхнікум. Праз год пачалася вайна, і васемнаццацігадовы юнак трапіў на фронт. Ад самага пачатку свайго салдацкага жыцця і да завяршэння яго ў Берліне Лазарук на ўласным вопыце спазнаў, як давалася народу перамога над фашызмам, колькі нечалавечых намаганняў, жорсткіх выпрабаванняў выпала на яго лёс. Увесь гэты вопыт, гэтая навука былі ці не самымі важнымі для далейшага жыцця вучонага. У 1947 г. ён паступіў на філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (сёння Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка), у якім Міхаіл Арсенавіч "затрымаўся" болей як на 30 год. Ад выпускніка інстытута (дарэчы, з дыпломам выдатніка) да дацэнта, а затым прафесара кафедры і яе загадчыка, дэкана філалагічнага факультэта, прарэктара інстытута, нарэшце, дырэктара НДІ педагогікі (зараз Нацыянальны інстытут адукацыі) – такі педагагічны шлях М.А. Лазарука. Такім жа паслядоўным быў ён і ў навуцы – кандыдат, а затым доктар філалагічных навук, акадэмік Акадэміі навук Беларусі, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, замежны член Расійскай акадэміі адукацыі (перад тым, з 1978 па 1991 год, - член-карэспандэнт і правадзейны член Акадэміі педагагічных навук СССР). Не толькі гэты пералік ступеняў настойлівага ўзыходжання ў яго адносінах да навуковай і педагагічнай працы, але, перш за ўсё, дзесяткі кніг, болей дзвюх соцен іншых публікацый красамоўна і

пераканаўча сведчаць пра яго як вучонага, даследчыка, вядомага літаратуразнаўца і педагога.

Сталай літаратурнай працай М.А. Лазарук пачаў займацца з 1949 г. Спачатку пісаў вершы, байкі, але потым цалкам перайшоў на крытыку і літаратуразнаўства. Даследаваў гісторыю развіцця беларускай паэмы, пытанні тэорыі літаратуры. Пры яго актыўным і арганізацыйным удзеле былі створаны грунтоўныя калектыўныя працы па гісторыі асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі: "Антология педагогической мысли Белорусской ССР" (Масква, 1986) і манаграфічнае даследаванне "Асвета і педагагічная думка ў Беларусі : са старажытных часоў да 1917 года" (Мінск, 1985). Яны абуджалі павышаную цікавасць культурнай грамадскасці да нашай гістарычнай і духоўнай спадчыны ў сферы школьнага навучання і выхавання маладых пакаленняў. Як вучоны-літаратуразнавец М.А. Лазарук сфарміраваўся на распрацоўцы праблем літаратурнай навукі, на даследаванні сучаснай і даўнейшай гісторыі развіцця беларускай літаратуры. Шырока вядомы яго манаграфіі па гісторыі беларускай паэмы, грунтоўныя крытычныя працы, артыкулы аб творчасці вядомых беларускіх пісьменнікаў розных часоў, пачынаючы з Ф. Скарыны і канчаючы паэтамі-сучаснікамі. Большасць гэтых прац сабрана ў зборніку "Часу непадуладнае" (1981). Даследаванне агульных эстэтычна-стылёвых тэндэнцый беларускай літаратуры, распрацоўка тэарэтычных пытанняў, жанравых асаблівасцей беларускай паэзіі сталі тым грунтам, на якім былі створаны падручнікі для студэнтаў-філолагаў ("Уводзіны ў літаратуразнаўства" з А. Ленсу), вучняў сярэдніх школ ("Тэорыя літаратуры", "Беларуская літаратура" з В. Івашыным). Сумесна з А. Ленсу ім складзены таксама слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў. Работа над удасканаленнем школьных праграм і падручнікаў працягвалася ўсё жыццё. Пра гэта сведчыць і апошняя кніга М.А. Лазарука "Навучанне і выхаванне творчасцю", якая па-новаму асвятляе праблемы школьнай літаратурнай адукацыі, павышае цікавасць да новага ў выкладанні літаратуры.

Навуковы ўклад вучонага ў распрацоўку сістэмы школьнай літаратурнай адукацыі знайшоў шырокае прызнанне настаўніцкай і навуковай грамадскасці рэспублікі.

## *Творы:*


1. Беларуская паэма ў другой палавіне XIX – пачатку XX стагоддзя / М.А.Лазарук. – Мінск : Выд. БДУ, 1970.– 270 с.
2. Навучанне і выхаванне творчасцю : пед. роздумы і пошукі / М.А.Лазарук. – Мінск : Нар.асвета, 1994.– 200 с.
3. Пімен Панчанка : літ.-крыт. нарыс / М.А.Лазарук. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1959.– 142 с.
4. Родная літаратура : падруч.-хрэстаматыя для 6-га кл. / М.А.Лазарук. – Мінск : Нар.асвета, 1996.– 271 с.
5. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў: дапам. для настаўніка / М.А.Лазарук, А.Я.Ленсу. – Мн. : Нар. асвета, 1983.– 191 с.
6. Станаўленне беларускай паэмы : жанр паэмы і некаторыя асаблівасці развіцця бел. літ. у І-й пал. XIX ст. / М.А.Лазарук. – Мн. : Навука і тэхніка, 1968.– 197 с.
7. Тэорыя літаратуры ў школе : дапам. для вучняў сярэд. шк. / М.А.Лазарук. – Мінск. : Нар. асвета, 1967. – 163 с.
8. Часу непадуладнае : літ.-крыт. і публіцыст. арт. / М.А.Лазарук. – Минск : Маст. літ., 1981.– 239 с.


## *Аб жыцці і творчасці*


1. Кушнярэвіч, В. Руплівец беларускай асветы // ЛіМ.– 2001. – 6 ліп.– С.12.
2. Сасіновіч, Г. Жыццёвая дарога Міхася Лазарука // Слуцкі край.– 2001. – 30 чэрв.
3. Сасіновіч, Г. Жыццёвая дарога Міхася Лазарука [крытыка, літаратуразнаўцы, ураджэнца в. Ушловічы Слуц. р-на] // Слуцкі край. –2001.–30 чэрв.
4. Сасіновіч, Г. Нястомны працаўнік асветы // ЛіМ.– 2001. – 27 ліп.– С.12.



## Жнівень

### Павел Дзюбайла
(нар. 5.08.1931)

Нарадзіўся Павел Кузьміч Дзюбайла ў вёсцы Кукарава Бярэзінскага раёна Менскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1954). Адначасова працаваў у школах на Маладэчаншчыне. Служыў у Савецкай Арміі (1954-1955). Быў дырэктарам Бакштанскай сярэдняй школы Юрацішкаўскага раёна, інспектарам Маладэчанскага аблана. У 1960 г. скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР і з таго часу – навуковы супрацоўнік, а з 1968 г. – загадчык сектара беларускай савецкай літаратуры інстытута, цяпер – аддзела сучаснай беларускай літаратуры і крытыкі. Доктар філалагічных навук. Прафесар. Сябра СП СССР з 1967 г.

У друку з артыкуламі і рэцэнзіямі выступае з 1956 г. Аўтар літаратуразнаўчых і літаратурна-крытычных прац «Беларускі раман аб Вялікай Айчыннай вайне» (1964), «Праблемы стылю ў сучаснай беларускай прозе» (1973), «Вобраз нашага сучасніка ў беларускай прозе» (1978), «У вялікай дарозе» (1981), «Беларускі раман. Гады 70-я» (1982), «Наш сучаснік – у жыцці і літаратуры» (1984), «Панарама сучаснай беларускай прозы» (1986), «У пошуках духоўных каштоўнасцей: Беларуская проза сёння» (1987), «Вялікі Кастрычнік і сучасная беларуская літаратура» (1988), «Станоўчы герой у беларускай літаратуры» (1990). У сааўтарстве з В.Жураўлёвым і М.Луферавым напісана кніга «Праблемы сучаснай беларускай прозы» (1967). Адзін з аўтараў калектыўных прац «Беларуская савецкая проза: Раман і аповесць» (1971) і «История белорусской советской литературы» (1977).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980) за ўдзел у двухтомным даследаванні «История белорусской дооктябрьской литературы» і «История белорусской советской литературы».

### *Творы*

1. Беларускі раман : гады 70-я / П.К.Дзюбайла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982.- 174 с.
2. Беларускі раман аб Вялікай Айчыннай вайне / П.К.Дзюбайла. - Мн. : Навука і тэхніка, 1964.- 160 с.
3. Вобраз нашага сучасніка ў беларускай прозе / П.К.Дзюбайла. - Мінск : Навука і тэхніка, 1978.- 192 с.
4. Вялікі Кастрычнік і сучасная літаратура / П.К.Дзюбайла. - Мн. : Навука і тэхніка, 1988.- 88 с.
5. Наш сучаснік - у жыцці і літаратуры / П.К.Дзюбайла. - Мн. : Навука і тэхніка, 1984.- 71 с.
6. Панарама сучаснай беларускай прозы : літ.-крытыч. арт. / П.К.Дзюбайла. - Мінск : Маст. літ., 1986.- 192 с.
7. Праблемы стылю ў сучаснай беларускай прозе / П.К.Дзюбайла. - Мінск : Навука і тэхніка, 1973.- 176 с.
8. У вялікай дарозе : літаратурна-крытычныя артыкулы / Павел Дзюбайла. - Мінск : Маст. літ., 1981.- 189 с.
9. У пошуках духоўных каштоўнасцей : бел. проза сёння / П.К.Дзюбайла. - Мінск : Навука і тэхніка, 1987.- 176 с.

### *Аб жыцці і творчасці*

1. Губернатараў, М. Імператыў сумлення / М. Губернатараў // Настаўніцкая газета. – 1991. – 6 сак.
2. Рагуля, А. Дарогай пошукаў і знахода : [да 50-годдзя з дня нараджэння П.К. Дзюбайлы] / А. Рагуля // ЛіМ. – 1981. – 31 ліп.

## Верасень
## Ігнат Дуброўскі
(1906-2003)

Ігнат Дуброўскі (сапр. Ігнат Цімафеевіч Чарняўскі) нарадзіўся 4.09.1906 г. ў вёсцы Дуброва Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Працаваў загадчыкам магазіна спажывецкай кааперацыі ў сваёй вёсцы, справаводам сельсавета, загадчыкам аддзела прапаганды, затым сакратаром райкома камсамола ў Астрашыцкім Гарадку. У 1928-1929 гг. служыў у Чырвонай Арміі. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію ў Горках (1931) і аспірантуру пры Усесаюзным інстытуце эканомікі сельскай гаспадаркі ў Маскве (1937). Працаваў намеснікам дырэктара гэтага інстытута па навучальнай частцы. З 1937 г. – загадчык сектара аграрных праблем Інстытута эканомікі АН БССР. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны пайшоў на фронт, камандаваў батарэяй. Быў цяжка кантужаны і паранены пры абароне Масквы. Трапіў у палон, знаходзіўся ў канцлагеры ў Франкфурце-на-Майне. У 1945-1976 – зноў загадваў сектарам аграрных праблем Інстытута эканомікі АН БССР. Член Саюза пісьменнікаў СССР (з 1951).

З 1937 па 1976 г. займаўся навуковай працай. Даследаваў эканоміку сельскай гаспадаркі Беларусі. Аўтар шэрагу навуковых прац па праблемах развіцця сельскай гаспадаркі, працы сельскагаспадарчай тэматыкі падпісваў сапраўдным імем.

Дэбютаваў вершамі ў 1927 годзе. Да літаратурнай працы вярнуўся пасля вайны, пачаў пісаць празаічныя творы, нарысы. Аўтар аповесцей «Зямля маладзее» (1952), «Зямныя вузлы» (1967), зборнікаў апавяданняў «Радня» (1954), «Паўз самыя вокны» (1961) і нарысаў «Светлы шлях» (1959), «Да долі чалавечай» (1970), «Гамоніць Палессе» (1977), «На новыя кругі» (1980), «Час сеяць і час жаць» (1982), «Красна хата не толькі пірагамі» (1988). Аўтар крытычнага даследавання

нарыса «Нялёгкі хлеб» (1990). Пачынальнік аналітычнага нарысу ў беларускай літаратуры.

Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Дружбы народаў, Айчыннай вайны II ступені і медалямі. Заслужаны работнік культуры БССР (1981).

## *Творы*

1. Зямныя вузлы / І.Дуброўскі. – Мн.: Беларусь, 1967. – 238 с.
2. Красна хата не толькі пірагамі / І. Дуброўскі. – Мн.: Маст.літ., 1988. – 421 с.
3. Час сеяць і час жыць / І. Дуброўскі. – Мн.: Маст.літ., 1982. – 189 с.

## *Аб жыцці і творчасці*


1. Врановіч, С. Апавяданні пра моладзь / С. Врановіч // Беларусь. – 1954. - №8.
2. Лысенка, А. Пісьменнік. Вучоны. Грамадзянін : [да 95-годдзя з дня нараджэння І. Дуброўскага] / А. Лысенка // ЛіМ. – 2001. – 7 верас. – С.67.
3. Мыслівец, В. Зямная глыбіна / В. Мыслівец // Полымя. – 1976. - №9. – С.220-229.

## Кастрычнік



### Іван Муравейка
(нар. 21.10.1921)

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў Любанскую сярэднюю школу і паступіў у Мінскі камуністычны інстытут журналістыкі (1939). У канцы 1939 г. прызваны ў Чырвоную Армію. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях на Заходнім, Данскім, 3-м Украінскім і 1-м Беларускім франтах. Быў паранены. У 1945-1947 гг. у складзе Цэнтральнай групы войск служыў у Германіі. У 1947 г. дэмабілізаваны. У 1948-1952 гг. працаваў адказным сакратаром і рэдактарам любанскай раённай газеты «Кліч Радзімы». Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1964), працаваў адказным сакратаром любанскай раённай газеты «Будаўнік камунізму». Жыве ў Любані. Член Саюза пісьменнікаў СССР (з 1953 года). Ганаровы грамадзянін горада Любані.

Дэбютаваў у друку ў 1936 годзе (газета «Піянер Беларусі»). Аўтар зборніка паэзіі «Песня над палямі» (1955), кніжак вершаў для дзяцей «Ручаінкі» (1956), «Вось якія мы» (1958), «Пра работу і ляноту» (1960), «Дружная сямейка» (1961), «Сняжынкі-смяшынкі» (1962), «Сем колераў вясёлкі» (1965), «Лясное возера» (1970), «Мы таксама падрасцём» (1971), «Дуб і дубок» (1977), «Няхай сонца не заходзіць» (вершы, паэмы, казкі, 1981), «Я прыдумаў казку» (1985), «Вадзіца з крыніцы» (2006), «Растуць дзеці» (2011) і інш. У сааўтарстве з А. Андруховічам выдаў кнігу «На зямлі камунараў» (1979). Тэме вайны прысвечаны такія зборнікі вершаў, нарысаў, успамінаў як «Прынёс з вайны» (1991), «Была вайна» (2009), «Я — Іван з Беларусі» (2010, 2014).
Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I (двойчы) і II ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі, у т.л. медалём

Ф. Скарыны. Заслужаны работнік культуры БССР (1982). Лаўрэат літаратурнай прэміі «Залаты Купідон».

## *Творы*

1. Лебядзіны край : нарысы, вершы / Іван Муравейка. – Любань, 2009.– 68 с., [8] л. іл.
2. Была вайна : франтавыя запісы, расказы пра герояў вайны – любанчан, апавяданні, вершы / Іван Муравейка. – Любань, 2009.– 86, [2] с.
3. Куды ні пойдзеш - цуды знойдзеш : вершы, апавяданні, казкі, загадкі: [для мал. шк. узросту] / Іван Муравейка. – Мн. : Юнацтва, 2001.– 158, [1] с.
4. Прынёс з вайны : франтавыя запісы. Расказы пра аднапалчан. Апавяданні. Вершы / Іван Муравейка. – Мн. : Юнацтва, 1991.– 172 с.
5. Я - Іван з Беларусі : [нарысы, франтавыя запіскі, апавяданні, паэма, балады, вершы] / Іван Муравейка. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010.– 149, [4] с.

## *Аб жыцці і творчасці*

1. Аленчык, М. Ганаровы грамадзянін [а таксама выдатны пісьменнік] горада Любані [І.А. Муравейка] // Голас Любаншчыны.– 2001. – 23 чэрв.
2. Муравейка, І. В. Вам новы век даверыць не баюся : вершы / Іван Муравейка // Полымя. – 2012. – № 5. – С. 3-6.
3. Уручаны медаль Івану Муравейку // Голас Любаншчыны.– 1998.– 17 кастр.
4. Яфімава, М.Б. Срэбразвонная і мудрая паэзія "Няхай сонца не заходзіць "Інсцэніраванае прадстаўленне па творах І.А.Муравейкі // Пачатковая школа.– 2001.–N10.– С. 21.

## Снежань



### Сцяпан Александровіч
(1921-1986)

Нарадзіўся 15 снежня 1921 г. у гарадскім пасёлку Капыль Мінскай вобласці ў сям'і рабочага. Скончыў сярэднюю школу ў Капылі.

У 1939 г. паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і быў прызваны ў Чырвоную Армію. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Бег з нямецкага палону (Крывы Рог) на Капыльшчыну. Быў партызанам.

Скончыў універсітэт у 1950 г. Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Наваельненскай сярэдняй школе Дзятлаўскага раёна і ў Навагрудку (1944-1953), у Мінскім бібліятэчным тэхнікуме (1953-1958). У 1959-1963 гг. – навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры Імя Янкі Купалы АН БССР. З 1963 г. – дацэнт, з 1974 г. – прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Славы III ступені і медалямі.

Памёр 1 мая 1986 г у Мінску.

### *Творы*

1. Беларуская літаратура XIX - пачатку XX ст. : [хрэстаматыя крыт. матэрыялаў для ВНУ] / С.Х.Александровіч, В.С.Александровіч. – Мінск. : Выд-ва БДУ, 1978.– 256 с.
2. Вольнадумца з-пад Нясвіжа Аляксандр Незабытоўскі : З гісторыі бел.-пол. літ. і грамад.-паліт. сувязей у 40-я гг. XIX ст. / С.Х.Александровіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1975.– 119 с.
3. Гісторыя і сучаснасць : літ.-крытыч. арт. / С.Х.Александровіч. – Мн. : Беларусь, 1968.– 255 с.

4. Далёкія зарніцы : аповесць / С.Х.Александровіч. – Мн. : Беларусь, 1967.– 207 с.
5. Кнігі і людзі : даслед., арх. знаходкі, успаміны, эсэ : літ.-крытыч. арт. / С.Х.Александровіч. – Мінск : Маст. літ., 1976.– 207 с.
6. Крыжавыя дарогі : аповесць пра Якуба Коласа / Сцяпан Александровіч. – Мн. : Маст. літ., 1985.– 333 с.
7. Незабыўнымі сцежкамі / С.Х.Александровіч. – Мн. : Вучпедвыд БССР, 1959.– 135 с.
8. Па слядах паэтычнай легенды / С.Х.Александровіч. – Мінск : Нар. асвета, 1965.– 175 с.
9. Пуцявіны роднага слова : праблемы развіцця бел. літ. і друку другой паловы XIX – пачатку XX ст. / С.Х.Александровіч. – Мн. : Выд-ва БДУ, 1971.– 247 с.
10. Родная літаратура : хрэстаматыя для 9-га кл. / Склад. С.Х.Александровіч, А.Р.Навіцкі. – Мн. : Нар. асвета, 1967.– 380 с.
11. Слова - багацце : літ.-крытыч. артыкулы / С.Х.Александровіч. – Мінск : Маст. літ., 1981.– 414 с.

## ***Аб жыцці і творчасці***

1. 15 снежня - 80 год з дня нараджэння С.Х.Александровіча (1921-1986), крытыка, літаратуразнаўца, празаіка, ураджэнца г. Капыля // Новыя кнігі.- 2001.– N 10.– С. 14-17.
2. Пятровіч, І. Радзіма мая – Капыль // Слава працы.– 2001. – 15 снеж.

**Беларускія пісьменнікі-юбіляры 2016 года:**
**бібліяграфічны паказальнік (ІІ паўгоддзе)**

Складальнікі: Мельнічак А.А.

Рэдактар: Законнікава Л.Р.

Адказны за выпуск: Лыка М.У.

Падпісана да друку 07.06.2016 г.

Тыраж 3 экз. Заказ № 10

220005 г. Мінск, вул. Гікалы, 4
Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна